**УДК 39(476-22)(091)+316.343:63-051(476)(091)** **DOI 10.52928/2070-1608-2025-75-3-65-70**

# САЦЫЯЛЬНА-ДЭМАГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА БЕЛАРУСКАЙ ПАВАЕННАЙ ВЁСКІ

***канд.гіст.навук, дац. А.В. СУМКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0002-9940-0236***

*Разглядаецца сацыяльна-дэмаграфічная структура паваеннай беларускай вёскі. Асноўная ўвага надаецца аналізу змен у колькасці і складзе сельскага насельніцтва, занятасці, міграцыйных працэсах, а таксама ўзростава-гендарнай і сацыяльнай трансфармацыі вясковай супольнасці. У якасці крыніц выступілі як архіўныя дакументы, так і матэрыялы вуснай гісторыі.*

***Ключавыя словы:*** *пасляваенная вёска, вусная гісторыя, дэмаграфія, сацыяльная структура.*

**Уводзіны.** Асноўнай крыніцай па сацыяльным і дэмаграфічным паказчыках насельніцтва з'яўляюцца дакументы Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення БССР. Інфармацыю пра сацыяльна-дэмаграфічны склад паваеннай вёскі ўтрымліваюць адначасовыя ўлікі сельскага насельніцтва, якія праводзіліся на падставе распараджэнняў СМ СССР і СМ БССР абласнымі статыстычнымі ўпраўленнямі. На 1 студзеня 1945 г. і 1 студзеня 1947 г. фіксавалі палавы і ўзроставы склад насельніцтва, а на 1 студзеня 1948 г. улік праводзіўся асобна для розных груп гаспадарак: калгаснікаў, рабочых і службоўцаў, аднаасобнікаў[1]. Выніковыя даныя складана верыфікаваць, бо першапачатковыя падлікі ажыццяўляліся без апытанняў насельніцтва – на падставе звестак сельсаветаў і іншых органаў улады, якія не заўсёды былі дакладнымі. Тым не менш, атрыманая інфармацыя дазваляе вызначыць тэндэнцыі сацыяльна-дэмаграфічнага становішча ў паваенны час. Варта падкрэсліць, што матэрыялы Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення БССР дапаўняюць дакументы абласных і занальных архіваў Рэспублікі Беларусь, якія ўтрымліваюць рэгіянальныя справаздачы пра сацыяльна-дэмаграфічны склад вясковага насельніцтва. Менавіта гэтыя звесткі сталі асновай для фарміравання агульнарэспубліканскіх выніковых дакументаў.

**Асноўная частка.** Сельскае насельніцтва ў БССР з'яўлялася найбольш шматлікай сацыяльнай групай. На 1 студзеня 1941 г. яно складала 77% насельніцтва, на 1 студзеня 1945 г., пры наяўнасці катастафічных дэмаграфічных страт, складала абсалютную большасць (табліца). Суадносіны сацыяльных груп сельскага насельніцтва па абласцях Беларусі розніліся. Напрыклад, у студзені 1945 г. у Віцебскай вобласці было 427 278 сялян (гараджан 101 555), у лютым 1945 г. у Гродзенскай вобласці налічвалася 482 624 аднаасобніка (58 735 гаражан); у Полацкай вобласці сельскае насельніцтва складалася з калгаснікаў – 110 701, аднаасобнікаў – 151 911, іншых груп – 12 536; у Маладзечанскай калгаснікаў было 1 814 чалавек, аднаасобнікаў – 435 839, да іншых груп у межах сельскага насельніцтва адносілася 12 296 чалавек[2]. Дакументы аддзела статыстыкі сведчаць пра колькасныя змены кожны месяц, аднак суадносіны сацыяльных груп сельскага насельніцтва заходніх і ўсходніх абласцей Беларусі да актывізацыі працэсаў калектывізацыі ў канцы 1940-х гг. заставаліся ўмоўна стабільнымі.

Табліца. – Колькасць насельніцтва БССР, тыс. чал.[3]

| Вобласць | 01.01.1945 г. | | 01.01.1946 г. | |
|---|---|---|---|---|
| | Сяляне | Гараджане | Сяляне | Гараджане |
| Баранавіцкая | 496,6 | 83 | 499 899 | 72 468 |
| Бабруйская | 435,3 | 86,2 | 456 263 | 89 442 |
| Брэсцкая | 350, 0 | 54,7 | 361 182 | 62 702 |
| Віцебская | 433,8 | 113,3 | 456 566 | 143 810 |
| Гродзенская | 485,3 | 93,8 | 487 231 | 91 676 |
| Гомельская | 467,3 | 142,7 | 488 110 | 131 504 |
| Мінская | 491,5 | 215,3 | 494 998 | 243 850 |
| Магілёўская | 602,1 | 110,7 | 635 611 | 119 768 |
| Маладзечанская | 454, 7 | 41,6 | 446 704 | 32 119 |
| Пінская | 302,9 | 46,6 | 315 697 | 45 188 |
| Палеская | 316,6 | 46,2 | 322 996 | 50 411 |
| Полацкая | 364,7 | 29,9 | 386 637 | 41 130 |
| Усяго па БССР | 5200,8 | 1064,0 | 5 351 894 | 1 124 068 |

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 30. Воп. 5. Спр. 1701.
[2] НАРБ. – Ф. 30. Воп. 1. Спр. 447. – Л. 10–19.
[3] НАРБ. – Ф. 30. Воп.1. Спр. 447. – Л. 1–2.

Адным з наступстваў Вялікай Айчыннай Вайны стала дэфармацыя сацыяльна-дэмаграфічнай структуры беларускай вёскі. Людскія ахвяры абумовілі наяўнасць дэмаграфічных ям. На пачатак 1950 г. вясковае насельніцтва налічвала трохі больш за 6 млн. чалавек супраць 7 млн. 121 тыс. чалавек у 1940 г. [1, с. 16]. Дакументы партыйнага справаводства сведчаць пра значнае скарачэнне долі працаздольнага насельніцтва ва ўсіх рэгіёнах БССР у пасляваенны перыяд. Лічбы па Полацкай вобласці фіксуюць, што насельніцтва вёсак значна зменшылася ва ўсходніх раёнах вобласці (найбольш пацярпелыя па рэспубліцы) – да 56,6% ад даваеннага ўзроўню, прычым колькасць працаздольных жанчын пераважала ў некалькі разоў (на 1 студзеня 1946 г. ва ўсходніх раёнах было 7179 працаздольных мужчын і 34 644 працаздольныя жанчыны[4]. Асобна падкрэслівалася, што падлік працаздольных адбываўся на падставе ўзросту і не ўлічваў інвалідаў ці жанчын з маленькімі дзецьмі, што аб'ектыўна яшчэ больш скарачала колькасць працоўных рук.

Пры такім становішчы паўстала праблема максімальнага ўцягнення ў сельскагаспадарчую вытворчасць насельніцтва, якое магло працаваць. Галоўнай працоўнай сілай у вёсцы сталі жанчыны і непаўналетнія члены вясковай грамады. Паказальным пра суадносіны мужчынскага і жаночага насельніцтва з'яўляецца фрагмент з успаміну рэспандэнта са спаленай вёскі "*Вёска – дамоў на 40. Чатыры мужчыны* (з іх адзін старык, два інваліды ВАВ – аўт.), *астальныя жанчыны і дзеці*" (Суражскі р-н)[5]. Паваенная дыспрапорцыя полаўзроставай структуры была характэрна не толькі для БССР, але і іншых рэспублік Савецкага Саюза. Напрыклад, Валянціна Жыромская ў сваім даследаванні, прысвечаным жыццёваму патэнцыялу пасляваенных пакаленняў у Расіі, падкрэслівала, што істотную дапамогу ва ўсіх сферах дзейнасці ў пасляваенны час аказвалі падлеткі, састарэлыя калгаснікі і інваліды. Так, у 1948–49 гг. непрацаздольныя і састарэлыя калгаснікі выпрацавалі каля 8%, а падлеткі прыкладна 4% агульнай колькасці працадзён у калгасах. Разам з тым, даследчыца адзначала, што ўдзельная вага гэтай катэгорыі ў агульных затратах з года ў год зніжалася. На думку аўтара, гэта было звязана з тым, што асноўная колькасць падлеткаў вярнулася ў школы, а працавалі падлеткі ў калгаснай вытворчасці пераважна падчас канікул [2, с. 34]. Што датычыць пасляваеннай працоўнай штодзённасці беларускай вёскі, то спалучэнне матэрыялаў вуснай гісторыі і архіўных дакументаў дазваляе ўбачыць адмысловы ракурс праблемы, звязаны з дакладным вызначэннем ступені ўцягнутасці дзяцей і падлеткаў у калгасную і сямейную вытворчасць.

Палявыя матэрыялы фіксуюць розніцу ў жыццёвых стратэгіях поўных і няпоўных сем'яў. Сям'я, дзе быў працаздольны мужчына дэманстравала большую эканамічную ўстойлівасць. У той жа час няпоўныя сем'і, дзе галоўным кармільцам была жанчына, вылучаліся большай адаптыўнасцю і разнастайнасцю жыццёвых стратэгій. Мужчыны, якія заставаліся без сямейнай падтрымкі, часта абмяжоўваліся мінімальным наборам дзеянняў для выжывання, што падкрэслівае значэнне гендарных роляў і сацыяльных сувязей у складаных умовах: "*16 лет наверна мне было. Нас бралі на лесаразработку, – куда толькі мяне не пасылалі, усюды, былі даже сваі забівалі на рэчке вот, как у Віцебск, – мы ж жылі ў Багушевскім районе, Сененскім районе. А вот эта, с намі быў мужчына, ён у вайну где-та асталіся сямья. Сваяго ужо не было, а, можа, у пана служыў?.. Не знаю. Значыць, у няго не было нічога. Нашы, як мы ужо жылі на месце, дак мы дзержалі парасёнка, тады ужо і карову нажылі, так мы бралі. А этаму чалавеку далі у калхозе жыта, рожь, ня меленная, не абработанная. Вот он, бывала, с намі работает на поле, на торфаразработках (торф капалі, брыкеты каб капалі і так складалі-складалі, складалі). Ну, ён сварыць эту рожь у катялочак і так есць. Ні хлеба, ні заправленная, нічога! Вот і так было*"[6].

У канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. завяршылася вяртанне мужчын з войска, з палону, рэпатрыяцыя мужчын і жанчын, сагнаных у Германію і іншыя краіны. Гэта выклікала ўсплеск заключэння шлюбаў, якія не адбыліся ў перыяд вайны, для ўзроставых катэгорый, якія ўступілі ў шлюбны ўзрост напярэдадні і ў гады вайны. Акрамя гэтага, заключаліся шлюбы паміж тымі, хто ўступіў у шлюбны ўзрост у другой палове 1940-х гг. Усплёск шлюбнасці на мяжы 1950-х гг. быў звязаны не толькі з традыцыйнымі патэрнамі, але і дэмаграфічнымі наступствамі вайны. Разам з тым, крыніцы сведчаць, што сельскае насельніцтва паступова мяняе дэмаграфічныя паводзіны, традыцыйныя яго формы паступова слабеюць. Пасляваенная дыспрапорцыя полаў у шлюбных узростах спрыяла павелічэнню пазашлюбнай нараджальнасці, росту колькасці маці-адзіночак і няпоўных сем'яў. Матэрыялы палявых экспедыцый утрымліваюць запісы пра тое, што мужчыны, з'ехаўшы на заробкі, на будоўлю ці іншыя месцы працы на доўгі тэрмін, уступалі паралельна ў новыя шлюбы. Аднак матэрыялы вуснай гісторыі сведчаць пра тое, што ў трывалым сялянскім асяроддзі традыцыйная сістэма каштоўнасцей стрымлівала распаўсюджанне пазашлюбных адносін і рэгламентавала выбар шлюбнай пары. Успаміны фіксуюць, што ў вясковай грамадзе не віталася ўзроставая разбежка, калі жанчына была старэйшая за мужчыну. У такіх выпадках грамадства ўжывала маральны ціск, перш за ўсё, на жанчыну, што звычайна рабіла немагчымым афіцыйнае афармленне такіх адносін.

[4] НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 46. Спр. 148. – Л. 50.

[5] Архіў Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай (Архіў ЦВГ ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай). – Ф. 2. Воп. 6. Спр. 10.

[6] Архіў ЦВГ ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай – Ф. 2. Воп. 2. Спр.26.

Асаблівую ўвагу заслугоўвае пасляваенная практыка фіктыўных раздзелаў сямей, якая стала своеасаблівай формай сацыяльна-эканамічнай адаптацыі. Калі для аднаасобнікаў гэта быў спосаб мінімізацыі падаткавага ціску і засцярога ад занясення да катэгорыі кулакоў, то калгаснікі выкарыстоўвалі гэтую схему для павелічэння зямельных надзелаў. Гэта фіксуюць як матэрыялы палявых экспедыцый, так і дакументы органаў дзяржаўнай улады і кіравання. Напрыклад, па выніках праверак разбазарвання грамадскай зямлі на карысць асабістых гаспадарак калгаснікаў былі выяўлены парушэнні, калі на паперы людзі былі разведзены, а на самой справе вялі сумесную гаспадарку і мелі прысядзібны ўчастак, разлічаны на двух самотных калгаснікаў[7].

У пасляваенны перыяд савецкая дзяржава, у мэтах кампенсацыі дэмаграфічных страт, імкнулася стымуляваць нараджальнасць шляхам укаранення комплекснай сістэмы сацыяльнай падтрымкі мацярынства і дзяцінства. У 1944 г. быў выдадзены спецыяльны Указ Прэзідыума ВС СССР “Аб павелічэнні дзяржаўнай дапамогі цяжарным жанчынам, шматдзетным і адзінокім маці, узмацненне аховы мацярынства і дзяцінства”, устанаўленні ганаровага звання “Маці-гераіня” і заснаванні ордэна “Мацярынская слава” і медалі [2, с. 81]. Дакументы органаў дзяржаўнай улады і кіравання ўтрымліваюць шмат інфармацыі пра выдзяленне дзяржаўнай дапамогі дадзеным катэгорыям жанчын. У пратаколах першых паваенных гадоў пытанне выдзялення фінансавай дапамогі разглядалася вельмі часта. Тыповым з’яўляецца наступнае: па рашэнню выканкама Мядельскага райсавета было выдзелена мнагадзетнай маці на сёмага дзіцёнка з моманту вызвалення ад нямецкай акупацыі да 5-гадовага ўзросту малога па 2 000 рублёў у год[8]. Дзяржаўная дапамога распаўсюджвалася і на тых, хто выхоўваў дзяцей без бацькі альбо ніколі не бралі шлюб. З моманту публікацыі Указа ВС СССР з ліпеня 1944 г. па студзень 1953 г. было выдадзена шматдзетным і тым, хто выхоўваў дзяцей без бацькі 1 223 736 000 руб. [3, с. 25]. Аналіз архіўных дакументаў дазваляе казаць пра тое, што паміж прыняццем рашэння і атрыманнем рэальных грошай праходзіў значны прамежак часу, а іншы раз сустракаліся і парушэнні ў гэтай сферы. Аднак, негледзячы на пэўныя праблемы, сістэма фінансавай падтрымкі жанчын сведчыла пра мэтанакіраваную сацыяльную палітыку ў сферы мацярынства і дзяцінства, якая разглядалася як прыярытэтны накірунак развіцця савецкай дзяржавы.

Дзяржаўнае рэгуляванне рэпрадуктыўнай сферы ў перыяд пасляваеннага аднаўлення ажыццяўлялася не толькі з дапамогай матэрыяльнай падтрымкі, але і праз нарматыўныя абмежаванні, якія, напрыклад, датычыліся рэгламентацыі медыцынскіх працэдур (абмежаванні на правядзенне абортаў). Гэта, з аднаго боку, аб’ектыўна прывяло да росту колькасці шматдзетных сем’яў, а з другога – актуалізавала запыт на альтэрнатыўныя формы медыцынскай дапамогі. У паваенныя гады павялічвалася колькасць нелегальных абортаў. Напрыклад, за першае паўгоддзе 1947 г. у бальніцы Віцебскай вобласці паступіла 601 жанчына з абортамі, якія былі пачаты па-за лячэбнымі ўстановамі[9]. Кошты за таемныя аборты былі розныя, у залежнасці ад кваліфікацыі таго, хто рабіў, і ад гаротнага стану той, якая звярталася. У дакументах народных судоў сустракаліся расцэнкі каля 400 рублёў за аборт (≈ 90% сярэднямесячнай зарплаты). Аднак існавалі варыяцыі аплаты. Напрыклад, народны суд Бешанковіцкага раёна асудзіў на 5 гадоў жанчыну, якая зрабіла крымінальны аборт з цяжкімі наступствамі. За яго яна атрымала 200 рублёў і пуд пшаніцы[10]. Часткай стратэгіі кампенсацыі дэмаграфічных страт можна разглядаць і падатак на «халасцякоў», які з’яўляўся адмысловым інструментам мадэлявання пажаданых сямейных структур.

Прыкметнай з’явай разглядаемага перыяду была міграцыя насельніцтва з вёскі. У першую чаргу, гэта датычылася моладзі. Напрыклад, дзяўчыны, якія зыходзілі прыглядаць за дзецьмі ў горад, мелі магчымасць выйсці замуж і не вяртацца ў вёску. Гэта прафесія мела вялікі попыт на рынку працы. Цэнтральнае статыстычнае упраўленне паведамляла, што перасяленне сельскага насельніцтва ў горад у паваенныя гады было распаўсюджанай з’явай. Напрыклад, 17 ліпеня 1946 г. загадчык абласнога статыстычнага ўпраўлення Віцебскай вобласці паведамляў, што колькасць сельскага насельніцтва зменшылася за кошт пераезду ў гарады і выезду ў іншыя вобласці, большасць – у Заходнюю Беларусь[11]. Гэта было характэрна не толькі для азначанай вобласці, але і для ўсёй рэспублікі. Значныя маштабы працоўная міграцыя набывала ў тых рэгіёнах, што найбольш пацярпелі за гады Вялікай Айчыннай Вайны. Напрыклад, з Гомельскай вобласці пераязджалі ў Брэсцкую: “приехала сюда, так как здесь будет прожить легче, поскольку здесь не так разбито”[12]. Найбольш запатрабаваным накірункам для міграцыі ў паваенныя гады былі раёны Заходняй Беларусі, а таксама Ленінградская і Калінінградская вобласці. Асабліва выязджалі з Гомельскай, Палескай, Полацкай абласцей. Так, на працягу 1945–1946 гг. з Гомельскай вобласці ў азначаныя ввышэй мясцовасці з’ехала 5309 чалавек (1242 сям’і); у Полацкай вобласці, акрамя пераезду ў Польшчу, зменшылася колькасць сялян-калгаснікаў – пераехала болей за 1500 сямей[13].

---

[7] Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далее – ДАВВ). – Ф.7. Воп.1. Спр.11.

[8] Занальны дзяржаўны архіў горада Маладзечна. – Ф. 1864. Воп. 1. Спр. 2. – Л. 163.

[9] ДАВВ. – Ф. 2926. Воп. 2. Спр. 28.

[10] Там жа.

[11] НАРБ. – Ф. 30. Воп. 1. Спр. 799. – Л. 178.

[12] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Ф. 3-п. Воп. 1. Спр. 9. – Л. 68.

[13] НАРБ. – Ф. 30. Воп. 5. Спр. 1247. – Л. 89–91.

Асобна трэба адзначыць становішча сялян-перасяленцаў з Польшчы, уладкаваннем якіх займаліся мясцовыя органы ўлады, а кантроль за працэсам рассялення і далейшай адаптацыі быў ускладзены на партыйныя органы. Для сямей, якія вярталіся ў Беларусь, важным было інтэгравацца не толькі ў новую сацыяльна-эканамічную і палітычную прастору, але і ў мясцовы вясковы соцыум. Перасяленцы валодалі розным аб'ёмам рэсураў, адрозніваліся сацыяльным статусам, узроўнем адукацыі. На выбар іх жыццёвых стратэгій і адаптыўных практык на новым месцы ўплывалі як аб'ектыўныя, так і суб'ектыўныя фактары. Напрыклад, у красавіку 1945 г. у Магілёўскую вобласць пераехала 327 сямей, з іх у сельскую мясцовасць – 304 сям'і (1149 чалавек). З сабой яны прывезлі хатнюю жывёлу і сельскагаспадарчы інвентар[14]. З іх 95 сямей захавалі статус сялян-аднаасобнікаў (па дамоўленасці ім павінны былі адвесці столькі зямлі, колькі яны мелі на старым месцы, аднак не болей за 15 га), 30 сямей уступілі ў калгас, астатнія пайшлі працаваць на мясцовыя прадпрыемствы ці займаліся кустарным рамяством. Прычым, як сведчаць дакументы, у Мсціслаўскім і Хоцімскім раёнах з боку перасяленцаў, пераважна беззямельных, назіралася тэндэнцыя стварыць калгасы сваімі сіламі. Тым, хто ўступаў у калгас, выдзялялася 0,50 га зямлі, з большага, ужо засеянай. Перасяленцаў уладкоўвалі ў залежнасці ад магчымасцей таго ці іншага раёна. Некаторыя з іх бралі крэдыты на будаўніцтва жылля, бо іх размяшчалі ці ў пустых дамах, ці падсялялі, а некаторыя жылі ў намётах. Не ўсе з перасяленцаў былі задаволены ўмовамі жыцця і адносінамі да іх улады. Напрыклад, з Цішкоўскага сельскага савета 11 чалавек пераехала ў Заходнюю Беларусь[15]. Некаторыя так і не змаглі прызвычаіцца да новай рэчаіснасці і падавалі прашэнне аб вяртанні ў Польшчу.

Паваенныя ўлікі сельскага насельніцтва добра ілюструюць сітуацыю, асабліва ў заходніх абласцях, дзе ў другой палове 1940-х гг. адбываюцца прыкметныя зрухі. Уліковыя дакументы на 1 студзеня 1948 г. (у параўнанні з папярэднімі) ужо дэманстравалі змены ў катэгорыях гаспадарак. Фіксаваўся рост сялян-калгаснікаў за кошт з'яўлення новых калгасаў. Аднак, разам з тым, пераход аднаасобных гаспадарак у калгасны сектар не меў значнага ўплыву на змяншэнне аднаасобнага сектара, бо адначасова ў аднаасобных гаспадарках адбываецца раздзел і выдзяленне новых. З аднаго боку, гэта было звязана са з'яўленнем новай сям'і, а з другога, матэрыялы вуснай гісторыі сведчаць, што раздзел аднаасобных гаспадарак быў спецыфічнай жыццёвай стратэгіяй, якая дазваляла пазбегнуць працэдуры раскулачвання. Разам з тым, у канцы 1940-х гадоў пад уплывам актывізацыі працэсаў калектывізацыі і арганізацыі новых калгасаў змяняюцца суадносіны сацыяльных груп сялянскага насельніцтва ў бок змяншэння колькасці сялян-аднаасобнікаў і, адпаведна, павелічэння сялян-калгаснікаў.

Дзякуючы актыўнай індустрыялізацыі сельскіх раёнаў, на пачатак 1948 г. колькасць рабочых і служачых у сельскай мясцовасці павялічылася на 72,6% у параўнанні з папярэднім годам[16]. Значны рост тлумачыцца лакалізацыяй прамысловых прадпрыемстваў (спіртавых, цагельных заводаў, леспрамгасаў і хімлесгасаў) у сельскай мясцовасці і іх кадравым забеспячэннем за кошт мясцовага насельніцтва. Фарміраваўся новы сацыяльны пласт: у адрозненне ад асноўнай масы сельскіх жыхароў, занятых натуральнай гаспадаркай (калгаснікаў, што атрымлівалі, пераважна, працадні, і аднаасобнікаў, якія жылі за кошт рэалізацыі ўласнай прадукцыі), рабочыя і служачыя мелі істотныя сацыяльна-эканамічныя перавагі ў тагачасных умовах. Іх становішча адрознівалася магчымасцю атрымліваць стабільны грашовы заробак, што, хоць і не гарантавала высокага дабрабыту, але дазваляла купляць прамысловыя тавары і дапаўняць харчаванне за кошт пакупкі прадуктаў.

Што датычыцца колькасці сельскага насельніцтва на 1 студзеня 1948 года, то меліся праблемы з дакладным вызначэннем, у першую чаргу, механічнага прыросту. Справаздачы статыстычных аддзелаў фіксавалі недакладнасці ў працы па ўліку з боку сельскіх саветаў, асабліва ў Заходняй Беларусі. Акрамя таго, у памежных раёнах, напрыклад, па Брэсцкай вобласці, улік механічнага перамяшчэння насельніцтва вёўся толькі ў пашпартызаваных раёнах (5 з 14). Асобнай праблемай стаў улік дзяцей і падлеткаў. Напрыклад, па інфармацыі сельскіх саветаў па Брэсцкай вобласці дзяцей ва ўзросце ад 7 да 15 гадоў налічвалася 95 488, а па інфармацыі абласнога аддзела адукацыі на пачатак навучальнага года (1947/48 г.) – 61 886 чалавек[17]. Улік аддзела народнай адукацыі фарміраваўся падчас апытання настаўнікамі глаў сямей. Прычым былі выяўлены цікавыя тэндэнцыі адносна таго, што сяляне імкнуліся не называць дакладны ўзрост сваіх дзяцей, каб пакінуць іх у гаспадарцы для працы. Акрамя таго, дакументы Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення БССР адзначаюць, што значная колькасць насельніцтва не мела метрык.

Дэмаграфічная сітуацыя ў краіне адбілася на полаhistoлевай ідэнтыфікацыі і ўяўленнях аб прафесійных ролях мужчыны і жанчыны. У перыяд пасляваеннага аднаўлення дзяленне на "мужчынскія" і "жаночыя" прафесіі, якое склалася пад уплывам сфарміраваных у міжваенны перыяд гендэрных стэрэатыпаў, пэўным чынам нівеліравалася. У паваенныя гады жанчынам прыйшлося асвойваць і працаваць практычна па ўсіх спецыяльнасцях і прафесіях, якія ў мірны час займалі мужчыны. Жанчыны працавалі трактарыстамі, шафёрамі і г.д. Асобна трэба адзначыць кадравы склад адміністрацыйнай вертыкалі ў паваенны час. Адсутнасць неабходнай колькасці партыйна-савецкіх работнікаў вымушала прызначаць на кіруючыя пасады розных ўзроўняў (ад сельскага савета да рэспубліканскага) жанчын.

[14] Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці – Ф. 9. Воп. 9. Спр. 29. – Л. 14.
[15] Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці – Ф. 9. Воп. 9. Спр. 29. – Л. 34.
[16] НАРБ. – Ф. 30. Воп. 5. Спр. 1701. – Л. 58.
[17] Там жа. – Л. 59.

Напрыклад, за 1948 г. па Полацкай вобласці на кіруючую работу было прызначана 190 жанчын, з іх 98 – на савецкую, 29 – на гаспадарчую, 63 – на кааператыўную [3, с. 22]. Біяграфічныя наратывы пра пасляваенную рэчаіснасць таксама фіксуюць гэтую асаблівасць. Так, за Асвейшчынай у калектыўнай памяці насельніцтва рэгіёну замацавалася ўспрыманне яго як “жаночай рэспублікі” – амаль усе ключавыя пасады займалі жанчыны, нават пасаду пракурора.

У Заходняй Беларусі назіралася тэндэнцыя прызначэння на кіруючыя пасады выхадцаў з Усходняй Беларусі. Паказальнай з'яўляецца інфармацыя з дакладной запіскі аб выкананні пастановы ЦК КП(б)Б ад 29 кастрычніка 1946 г. “Пра работу Гродзенскага абкама КП(б)Б у сферы падбора на кіруючую работу людей з мясцовага насельніцтва (22 мая 1947 г.)”[18]. У дакуменце адзначалася, што існаваў недавер да мясцовых жыхароў і гэта адбівалася на кадравых рашэннях. Так, на пасады, якія ўваходзілі ў наменклатуру абкама КП(б)Б, з 1921 пасады было 280 чалавек мясцовых жыхароў. У асобных раёнах вартаўнікамі школ і сельпо падбіралі выключна людзей, якія прыехалі з усходніх абласцей. У Гродзенскай вобласці з 222 сельскіх саветаў толькі ў 100 старшынямі працавалі мясцовыя жыхары. Неабходна адзначыць, што спецыфіка Заходняй Беларусі ў першыя паваенныя гады накладала адбітак і на выкананне службовых абавязкаў, што адлюстроўваюць дакументы справаводства мясцовай улады: “Исполком райсовета не нацеливает сельсоветы на самостоятельное решение ими задач, а занимается простой подменой их. Председатели сельсоветов ждут “команды” из района и уполномоченных, без чего зачастую самостоятельно не решают вопросы” [4, с. 268]. Разам з тым, калі казаць пра агульную лічбу, то адзначаны дакумент утрымлівае інфармацыю пра тое, што на 25 красавіка 1947 г. на кіруючых пасадах у савецкіх, гаспадарчых і гандлёвых арганізацыях Гродзенскай вобласці працавала да 6000 мясцовых жыхароў[19].

Для вырашэння задач, якія паўсталі перад краінай у аднаўленчы перыяд, патрабаваліся вялізныя матэрыяльныя і працоўныя рэсурсы. Усё гэта запатрабавала ад людзей максімальнай самааддачы і напружання, што не магло негатыўна не адбіцца на дэмаграфічнай сітуацыі таго часу: на працягласці жыцця, стане здароўя, тэмпах узнаўлення, сямейна-шлюбных адносінах.

**Заключэнне.** Пасляваенная беларуская вёска перажывала глыбокія сацыяльныя і дэмаграфічныя змены, абумоўленыя наступствамі Вялікай Айчыннай Вайны, аднаўленнем народнай гаспадаркі і савецкай мадэрнізацыяй сельскай гаспадаркі. Рэха вайны лягло цяжарам на пакаленні людзей, змяніўшы пола-ўзроставую структуру, рысы шлюбнага і сямейнага становішча. Катастрафічная колькасць забітых і знявечаных стала прычынай узнікнення дэмаграфічных ям з доўгатэрміновымі наступствамі для мясцовага насельніцтва. На паступовае павелічэнне колькасці насельніцтва ў першыя гады пасля вызвалення ўплываў шэраг фактараў: натуральны прырост (па матэрыялах ЗАГСа), механічны прырост (па даных органаў міліцыі), вяртанне дэмабілізаваных і рэпатрыянтаў, перасяленне з Польшчы ці ў Польшчу, працоўная мабілізацыя і міграцыя.

Сацыяльная структура сельскага насельніцтва Беларусі ў першыя пасляваенныя гады (1945–1948 гг.) характарызавалася істотнымі рэгіянальнымі адрозненнямі. Агульная дынаміка суадносін сацыяльных груп да пачатку масавай калектывізацыі (1949 г.) заставалася адносна стабільнай. Штомесячныя статыстычныя справаздачы дзяржаўных і партыйных органаў фіксавалі павольныя змены, але не кардынальныя зрухі. Сітуацыя змянілася ў канцы 1940-х гг., калі з актывізацыяй тэмпаў калектывізацыі на тэрыторыі былой Заходняй Беларусі рэзка скарацілася колькасць сялян-аднаасобнікаў на карысць калгаснага сектара. Паралельна назіраўся значны прырост колькасці рабочых і служачых у сельскай мясцовасці, асабліва прыкметны ў заходніх абласцях, дзякуючы стварэнню шырокай сеткі МТС і іншых дзяржаўных прадпрыемстваў. Гэты працэс спрыяў знікненню рэгіянальных адрозненняў і фарміраванню аднароднай сацыяльнай стратыфікацыі, тыповай для ўсёй тэрыторыі БССР. Асаблівасцю заходніх абласцей стаў больш рэзкі пераход ад традыцыйнай сялянскай структуры да савецкай мадэлі з перавагай калгаснага сектара і сельскай інтэлігенцыі.

Дэмаграфічная сітуацыя ў краіне адбілася на поларолевай ідэнтыфікацыі і ўяўленнях аб прафесійных ролях мужчыны і жанчыны. У 1950-я гг. пачаўся адток моладзі ў гарады на будаўніцтвы або заводы, што паскорыла старэнне вёскі. Дзяржаўнае рэгуляванне рэпрадуктыўнай сферы ў перыяд пасляваеннага аднаўлення ажыццяўлялася не толькі з дапамогай матэрыяльнай падтрымкі, але і праз нарматыўныя абмежаванні.

ЛІТАРАТУРА


1. Белязо А.П. Беларуская вёска ў пасляваенныя гады (1945 – 1950). – Мінск : Выд-ва БДУ, 1974. – 176 с.
2. Жиромская В.Б. Жизненный потенциал послевоенных поколений в России: историко-демографический аспект: 1946 – 1960 / отв.ред. Ю.А. Поляков. – М. ; Берлин : Директмедиа Паблишинг, 2020. – 310 с.
3. Барабаш Н.В. Роль женщины в послевоенном развитии сельского хозяйства в Беларуси. 1944 – 1950-е гг. // 1941 год: трагедия и героизм советского народа / редкол: В.П. Скок (отв. ред.). – Минск : БГПУ, 2022. – 159 с.
4. Послевоенное развитие Глубокского района: 1944 – 1950 гг.: док. и материалы / сост. Н.А. Боровик и др. – Минск: Медисонт, 2010 – 424 с.


*Паступіў 04.05.2025*

[18] НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 29. Спр. 566. – Л. 212–214.
[19] НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 29. Спр. 566. – Л. 213.

## СОЦИАЛЬНО-ДЕМОГРАФИЧЕСКАЯ ХАРАКТЕРИСТИКА БЕЛОРУССКОЙ ПОСЛЕВОЕННОЙ ДЕРЕВНИ

***канд. ист. наук, доц. Е.В. СУМКО***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*Рассматривается социально-демографическая структура послевоенной белорусской деревни. Основное внимание уделяется анализу изменений в численности и составе сельского населения, занятости, миграционных процессах, а также возрастно-гендерной и социальной трансформации сельского сообщества. В качестве источников выступили как архивные документы, так и материалы устной истории.*

***Ключевые слова:*** *послевоенная деревня, устная история, демография, социальная структура.*

## SOCIO-DEMOGRAPHIC CHARACTERISTICS OF THE BELARUSIAN POST-WAR VILLAGE

***E. SUMKO***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The socio-demographic structure of the post-war Belarusian village is examined. The main focus is on analyzing changes in the size and composition of the rural population, employment, migration processes, as well as age-gender and social transformation of the rural community. The sources included both archival documents and oral history materials.*

***Keywords:*** *post-war village, oral history, demography, social structure.*